інш. падпісаў «Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада БССР», нарком фінансаў БССР. Дэлегат І Усебел. з'езда Саветаў у Мінску (лют. 1919), чл. ЦВК БССР, з сак. 1919 чл. ЦК КП(б)ЛіБ. З мая 1919 на кіруючых пасадах у Чырв. Арміі, у 1921—36 у Данбасе, Маскве, Ульянаўску, Ташкенце і інш., з 1936 нам. наркома земляробства СССР. У 1936 арыштаваны як удзельнік «трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра», 22.8.1936 Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны 13.6.1988.

*Эдуард Карніловіч.*

**РЭЙНШТЭ́ЙН** Барыс Ісаевіч (23.6.1866, Магілёў — 1947), рэвалюцыйны дзеяч, публіцыст. З пач. 1880-х г. уваходзіў у нарадавольскія гурткі Растова-на-Доне, Екацярынадара. У 1886 эмігрыраваў у Швейцарыю, дзе ў 1889 разам з паліт. эмігрантамі заснаваў «Гурток маладых нарадавольцаў». З лета 1889 у Парыжы, дэлегат 1-га кангрэса ІІ Інтэрнацыянала. За захоўванне выбуховых рэчываў у сваёй кватэры арыштаваны і 5.6.1890 прыгавораны да 3 гадоў катаргі. У 1901 эмігрыраваў у ЗША: чл. прафс. арг-цыі «Індустрыяльныя рабочыя свету», Амерыканскай сацыяліст. рабочай партыі (да 1917). З чэрв. 1917 у Расіі. Са снеж. 1917 у Наркамаце замежных спраў, потым заг. аддзела ВЦВК. У 1918—19 удзельнічаў у выданні газ. «Call» («Прызыў»), удзельнічаў у падрыхтоўчай рабоце па стварэнні Камінтэрна. У 1919 у штабе Паўд. фронту. З 1920 заг. аддзела Прафінтэрна, у 1923—35 у Выканкоме Камінтэрна, супрацоўнічаў у час. «Коммунистический интернационал».

*Тв.:* К процессу Фостера и других американских коммунистов // Коммунистический интернационал. 1923. № 25; Гомперс — величайший провокатор в истории // Там жа. 1925. № 1 (38).

*Эмануіл Іофе.*

**РЭЙТАН** Тадэвуш [1742 ?, в. Грушаўка Навагрудскага пав. (ахрышчаны 20.8.1742, г. Ляхавічы Навагрудскага пав.) — 8.8.1780], палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай. Паходзіў са шляхецкага роду — уладальнікаў Грушаўкі. Вучыўся ў піярскай школе і Калегіум Нобіліум у Варшаве. Служыў у войску. Паводле некат. звестак, удзельнічаў у *Барскай канфедэрацыі.* Быў абраны паслом ад Навагрудскага пав. на *сойм 1773—75,* дзе планавалася зацвердзіць 1-ы падзел Рэчы Паспалітай. Разам з пасламі ад Навагрудскага пав. С.Корсакам і ад Мінскага пав. С.Багушэвічам рашуча супрацьдзейнічаў анексіі зямель дзяржавы. Намагаўся перашкодзіць утварэнню на сойме канфедэрацыі, якая простай большасцю галасоў магла зацвердзіць падзел, але большасць паслоў сойма, падкупленая замежнымі дзяржавамі, яго не падтрымала. Канфедэрацкі суд пагражаў Р. крымінальным пакараннем і канфіскацыяй маёнтка. 1.12.1773 Р. склаў маніфест, дзе канстатаваў нелегітымнасць канфедэрацыі і тракгатаў пра падзел Рэчы Паспалітай. Страціў розум і быў вывезены братамі ў Грушаўку. Скончыў самагубствам. Яшчэ сучаснікі лічылі Р. нац. героем. Чатырохгадовы сойм 1788—92 абвясціў Р. «вартым нацыянальнай жалобы», а яго дзеянні — «ўзорам для пераймання». Р. прысвечаны шматлікія маст. творы, у т.л. аповесці Г. Жавускага, карціна Я.Матэйкі «Рэйтан — заняпад Польшчы» (1864—66), нарыс Ю.Нямцэвіча «Жыццё Тадэвуша Рэйтана» (1818) і інш. Р. услаўлены у паэме А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш». У сярэдзіне 19 ст. ў Грушаўцы быў устаноўлены бюст Р. (цяпер у Нац. музеі ў Кракаве), у 1993 — мемарыяльны знак.

*Літ.:* Жавускі Г. Тадэвуш Рэйтан: (З «Успамінаў пана Севярына Сапліцы, парнаўскага чэсьніка») // Спадчына. 1997. № 4; Сіцька З. Грушаўка // Дыялог. 1998. № 2; Wegner L. Tadeusz Rejtan, na sejmie warszawskim z roku 1773. Poznań, 1873; Konczynska W. Rejtan, Korsak i Bohuszewicz na sejmie 1773 r. Wilno, 1935; Michalski J. Rejtan i dylematy polakow w dobie pierwszego rozbioru // Kwartalnik historyczny. 1986. № 4.

**РЭ́ЙТАРШЧЫНА,** падатак у прыватнаўласніцкіх маёнтках ВКЛ у 17—18 ст., які ішоў на ўтрыманне войска феадалаў. У сярэдзіне 18 ст. ў радзівілаўскіх маёнтках Р. складала 6 злотых у год з цяглай сял. валокі і 3 злотых з прыёмнай валокі.

**РЭКАНСТРУ́КЦЫЯ** антрапалагічная, анатамічны метад пластычнай ці графічнай рэканструкцыі твару па чэрапе. Грунтуецца на распрацаванай ў 19—20 ст. даследчыкамі (Р.Марцін, М.Грэгар, Г. фон Вірхаў, М.М.Герасімаў, Г.В.Лебядзінская і інш.) шкале суадносін рэльефу касцей чэрапа і мяккіх тканак твару з улікам полаўзроставых, расавых і індывідуальных асаблівасцей. Методыка Р. складаецца з шэрагу паслядоўных этапаў, якія ўключаюць: антрапалагічны аналіз чэрапа (краніяметрычнае даследаванне, вызначэнне полу, узросту, расавых і морфафізіялагічных асаблівасцей); графічную рэканструкцыю фаса і профілю, пластычнае ўзнаўленне анатамічнай схемы галавы (мадэліраванне асн. мускулаў, вызначэнне таўшчыні мяккіх тканак на розных частках чэрапа, рэканструкцыя па схемах носа, вачэй і губ); стварэнне скульптурнага бюста-партрэта з улікам гіст. і этнаграфічных асаблівасцей касцюма, прычоскі, упрыгожанняў. Краніялагічны матэрыял для Р. збіраецца ў час археал. раскопак курганоў, могільнікаў, некропаляў, скляпоў. Найбольш цікавыя і характэрныя чарапы краніялагічных калекцый апрацоўваюцца паводле метаду Р. Скульптурныя партрэты стараж. продкаў людзей (пітэкантрапаў, неандэртальцаў), прадстаўнікоў розных археал. культур, гіст. асоб зроблены ў ЗША, Францыі, Англіі, Германіі, Чэхіі, Балгарыі і інш. У СССР методыку пластычнай рэканструкцыі распрацаваў Герасімаў, які разам з вучнямі стварыў галерэю скульптурных партрэтаў гіст. асоб: Яраслава Мудрага, Андрэя Багалюбскага, Усевалада Вялікае Гняздо, Івана Грознага, Улугбека, Цімура, Рудакі і інш. На Беларусі паводле метаду Р. на мясц. антрапалагічных матэрыялах, сабраных у выніку археал. раскопак, І.У.Чаквіным разам са скульптарам Л.П.Яшэнкам зроблена каля 20 рэканструкцый скульптурных бюстаў-партрэ-



Этапы **рэканструкцыі** антрапалагічнай.